*ЛідзіАна*

# *Выток пачуццяў*

**Вершы**

84(4Бел-4Гом)6
Л55

*ЛідзіАна*

-056152-

# Выток пачуццяў

Вершы

Гомель
ААТ "Полеспечать"
2007

Гомельская гарадская
цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма

УДК 882.6(476.2)-1
ББК 84(2Бел–4Гом)-5
Л55

**ЛідзіАна (Возісава, Л. П.)**
Л55 **Выток пачуццяў** [Тэкст]: вершы. – Гомель: ААТ "Полеспечать", 2007. – 76 с.
ISBN 978-985-6632-64-1

Для творчасці ЛідзіАны характэрны яскравасць, лірычнасць, пачуццё духоўнасці. Еднасць з прыродай, чалавечыя адносіны, любоў да ўсяго існага праходзяць галоўнай рысай твораў, дзякуючы яснасці і глыбіні пачуццяў.

Новая кніга аўтара напоўнена жыццесцвярджальным зместам, аптымізмам і верай...

**УДК 882.6(476.2)-1**
**ББК 84(2Бел–4Гом)-5**

ЦГБ імя А. ...эна
Музей аў...фа

**ISBN 978-985-6632-64-1**

© ЛідзіАна (Л. П. Возісава), 2007
© К. М. Возісава, афармленне, 2007

# ЛідзіАна

Незвычайны псеўданім. Ці ж не так? Два імёны схаваны ў ім. І справа аўтара, раскрываць гэты сакрэт ці не. Вы самі, пэўна, здагадаліся, што Лідзіі Возісавай гэта слова падказала само каханне, таму што большасць яе вершаў напоўнена любоўю і светам:

Напэўна, я сатканая з кахання,
Кахання да паэзіі, паэта...
Напэўна, кожным нервам
Я прызнанне
Высвечваю.
Дык дзе ж тут да сакрэтаў.

Жыву я, улюбёная у неба,
У сонца, кветкі, возера без донца,
У пах святочны матчынага хлеба,
У сон дзіцяці...
І ў цябе бясконца.

Заветныя словы любові знайшла паэтка і для сваёй вёсачкі Лебядзёўкі, што на Гомельшчыне. Тут яна нарадзілася, адсюль пайшла вучыцца ў Церахоўскую сярэднюю школу. І першы яе верш быў надрукаваны ў часопісе "Бярозка", калі ёй было трынаццаць год.

Пасля заканчэння школы ЛідзіАна пяць год працавала ў Гомелі. Потым паступіла ва універсітэт г. Іжэўска... вучылася... выйшла замуж... нарадзіла траіх дзетак...

Але ж былі ў яе жыцці і незвычайныя выпадкі. Яны мянялі накірунак яе жыццёвай плыні. Напрыклад, ва Удмурціі, калі журба па Беларусі, родных мясцінах стала неадольнай, адбылося вось што...

Парывам ветру да яе ног прыбіла пажоўклую газету, яна падняла яе і прачытала: "Народа моего живое сердце, о Беларусь, во мне струишь ты кровь…». Гэту старонку "Литературной газеты" з нізкай вершаў (у перакладзе на рускую мову) свайго земляка, вядомага паэта Анатоля Грачанікава яна беражэ і цяпер. А тады выспела думка аб пераездзе ў Гомель, на бацькаўшчыну, што яна і зрабіла.

ЛідзіАна прадаўжала вучыцца. Атрымала яшчэ адну вышэйшую адукацыю, бо цікавілася псіхалогіяй, гісторыяй рэлігіі.

Пісала вершы на беларускай і на рускай мовах. Адна за адной выйшлі тры кнігі паэзіі: “Прызнанне”, “Касание Перста”, “Следы”. Так яна ўвайшла ў асяроддзе паэтаў. Актыўна друкавалася ў рэспубліканскім і мясцовым друку, а таксама ў Расіі, у перакладзе на рускую мову пісьменнікамі Ул. Парыгіным, М. Юніцкай, А. Алешынай.

Народныя песні, пераказы, прыказкі і прымаўкі будзілі фантазію паэткі, хвалявалі яе душу, выліваліся ў мастацкія вобразы. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў прытчах. ЛідзіАна спрабуе сябе ў розных жанрах: ад чатырохрадкоўя і калыханак да апавяданняў і эсэ...

Паэтка і сама ахвотна выступае на сцэне, расказвае пра народныя абрады, спявае песні, танцуе. Пасняхова выкарыстоўвае прыёмы фальклорнай паэтыкі і ў сваёй творчасці. Вось чаму лепшыя яе вершы – напеўныя, лёгка чытаюцца. Яны пранізаны любоўю і аптымізмам, верай у светлы розум чалавека і яго дабрыню.

Паэзія для яе – гэта малітва, дабрыня – гэта цяпло душы, а душа – гэта тое, што робіць усіх нас жывымі і адухоўленымі.

**НІНА ШКЛЯРАВА,**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

# "ВЕРШЫ – СТАН МАЁЙ ДУШЫ !"

Такое прызнанне западае ў памяць, кранае сэрца. Бо, відавочна, што душа ў паэта – шчырая, адкрытая, як у таго дзіцяці. Таму ўзнікае зацікаўленасць да творцы. А ў мяне – да яе творчасці, тым больш, што мы жылі побач з дзяцінства.

Лідзія Возісава (ЛідзіАна) нарадзілася і вырасла ў вёсцы Зэфельд Добрушскага раёна (з нядаўняга часу – Лебядзёўка). Яе бацькі – працавітыя вяскоўцы. Бацька Пятро рабіў у мясцовым калгасе трактарыстам, камбайнёрам, шафёрам… Быў, як кажуць у такіх выпадках, майстрам на ўсе рукі. Акрамя таго, што ён быў добрым плотнікам, пчаляром (меў вясковае прозвішча "Чмель"), добра клаў печы і грубкі, умеў граць на гармоніку. Як казалі ў вёсцы, граў "з пералівамі, з пераборамі". Маці адпрацавала даяркай амаль трыццаць гадоў! І як памятаюць у Зэфельдзе, Зінаіда была спрытнай, прыгожай жанчынай, з доўгімі густымі валасамі, якая ўмела добра танцаваць і спяваць высокім голасам. Ведала шмат народных песен, з яе вуснаў гучалі прыпеўкі на любую тэму. Да гэтай пары яна добрая гумарыстка і фантазёрка, якая нешта выдумляе і на святы, і штодня, заўсёды весяліць людзей, умее прабачыць кожнага, бо вялікая аптымістка.

З дзяцінства зведала будучая паэтэса нялёгкую сялянскую працу, бо была першай матулінай памочніцай на ферме. А сям'я ж Плешкуновых лічылася мнагадзетнай! Таму ўсе клопаты аб малодшых трох сястрычках і брацiку леглі на плечы Лідачкі…

Як прызнаецца Лідзія Пятроўна, прыказкі і прымаўкі, мудрыя біблейскія выслоўі заўсёды чуліся ў іхняй хаце ад бабулі Марыі, у дзявоцтве Гадлеўскай, якая нарадзілася "ў вялікай шляхетнай сям'і", дзе было шэсць дзяцей. Яна шмат чаго ўмела рабіць сваімі умелымі рукамі. Ад бабулі засталіся прыгожыя ручнікі, настольнікі, якія яна ткала з ільну. Уладкаваўшыся за швейнай машынкай, Марыя Фёдараўна любіла спяваць. Голас у яе быў звонкі, прыемны, які кранаў сэрца. Асабліва падабалася ёй, калі старэйшая ўнучка таксама імкнулася падцягнуць да належнай танальнасці старадаўнюю песню. Ад сваёй бабулі Лідачка навучылася шыць, вышываць, вязаць, нават маляваць, даглядаць за кветкамі.

А вось доўгімі зімовымі вечарамі бабулька чытала ўслых для ўсёй сям'і Біблію. Дарэчы, яна добра перакладала са старaславянскай мовы, аздабляла свой аповед непаўторнымі прыказкамі, параўнаннямі, афарызмамі. Яшчэ Марыя Фёдараўна часцяком успаміналa пра свайго мужа, Фёдара Львовіча, які быў цудоўным чалавекам, добрым сем'янінам, бацькам чатырох сыноў. Варта нагадаць, Фёдар Львовіч Плешкуноў, дзядуля Лідзіі Возісавай, быў не толькі дыпламаваным лекарам, але і вядомым пчаляром у калгасе. Яшчэ ён любіў спяваць як беларускія, так і рускія, украінскія і польскія песні разам з жонкай. Але рэпрэсіі, турма на Салаўках, дзе ён быў таксама лекарам, каштавалі яму жыцця. Дарэчы, калі ў краіне былі гады духоўнага забыцця, калі не хапала святароў, Марыю Фёдараўну запрашалі сем'і навакольных вёсак, каб яна чытала

Псалтыр і рабіла ўсё неабходнае, што тычылася нябожчыкаў. Да гэтай пары ў Зэфельдзе ўспамінаюць тыя часы. І яшчэ. У звычайныя дні і па святах жанчыны і мужчыны вёскі збіраліся ў чыёй-небудзь хаце, чыталі Біблію і спявалі псалмы. Бабуля заўсёды брала з сабою ўнучку і вучыла яе спяваць. А калі Ліда навучылася пісаць, то перапісвала ўсім жадаючым псалмы, царкоўныя песні пад дыктоўку бабулі...

Успаміны пра маленства заўсёды хвалююць, застаўляюць спыніцца і азірнуцца. Адразу ўяўляецца русавалосая дзяўчынка, якая бяжыць па росным лузе па шчаўе альбо купаецца разам са сваімі сяброўкамі ў сажалцы. У вольную хвілінку лепшым дарадцам былі кніжкі, патаемны сшытак з асабістымі нататкамі і вершамі. Гэтыя літаратурныя практыкаванні першым надрукуе дзіцячы часопіс "Бярозка", а потым і іншыя выданні. Колькі тады было радасці! Успамінаецца, як гаманілі вясковыя кабеты пра Лідачку Плешкунову. Дзівіліся з трынаццацігадовай паэткі.

Настаўнікі Перарастаўскай васьмігодкі ўсяляк падтрымлівалі юную паэтэсу, давалі слушныя парады. Несумненна, яны жадалі, каб дзяўчынка спраўдзіла надзеі, знайшла правільную сцежку ў жыцці. У Цярахоўскай сярэдняй школе таксама была сяброўская падтрымка, бацькоўскі клопат… І Лідачка Плешкунова апраўдала надзеі сваіх педагогаў. Праз некалькі гадоў у творчай скарбонцы ЛідзіАны з'явяцца асабістыя зборнікі паэзіі. Змястоўныя і прывабныя знешне. Гэта – "Прызнанне", "Касание Перста", "Следы", "Выток пачуццяў,"Боская птушка", "Эхо небес". Да іх трэба далучыць шматлікія публікацыі ў перыядычным друку, вершы, апавяданні…

Скончыўшы Цярахоўскую сярэднюю школу , выпускніца ідзе працаваць. Але Лідзія марыла пра станоўчую адукацыю, таму яна едзе вучыцца ва універсітэт, у горад Іжэўск. Студэнцкія гады праляцелі імгненна. Стала працаваць адказным сакратаром раённай газеты… Пісала артыкулы, вершы, апавяданні, актыўна друкавалася. І … сумавала па Беларусі.

У 1983 годзе Лідзія Возісава са сваёй сям'ёй вяртаецца ў Гомель. Адразу ўладкавалася выхавальніцай у дзіцячы садок. Гады праз тры яна ўжо робіць адказным сакратаром у раённым таварыстве "Кніга".

Па-ранейшаму "сябруе" з паэзіяй, ладзіць сустрэчы з чытачамі, актыўна друкуецца ў мясцовым і рэспубліканскім друку. Менавіта ў гэты час яна атрымала другую вышэйшую адукацыю. Штуршком да гэтага стала цікавасць да псіхалогіі, парапсіхалогіі і гісторыі рэлігіі. Цікавасць узнікла, калі яна тры гады запар праходзіла практыку і абараняла дыплом па вышэйшай нервовай дзейнасці пры кафедры біяфізікі Ленінградскага дзяржуніверсітэта. Тады і пачала пісаць на духоўную тэму.

У сваёй разнапланавай творчасці паэтэса адкрывае нам шмат цікавых біблейскіх таямніц, мякка, тактоўна павучае: "Поверь, как маленький ребенок, что Бог с тобой всегда с пелёнок, И вера будет, словно мать, твои мечты осуществлять…", "Словами не бросайся – не дрова! Глядишь – и уцелеет голова…", "Как ни копи

богатство для чертога, но вечные сокровища – у Бога…” Калі чытаеш гэтыя мудрыя вершаваныя радочкі, разумееш, што перад табой – сапраўдны творца. Разумны, шматгранны, па-свойму цікавы, прыцягальны. Не дзіўна, што вершы Лідзіі Возісавай, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, прымушаюць людзей азірнуцца на сябе, застаўляюць думаць, разважаць, перажываць…

Асабліва хвалююць паэтэсу маральна-этычныя праблемы ўзаемаадносін чалавека і грамадства, стан роднай мовы. Хоць яна свабодна валодае і піша на рускай мове, але лічыць, што без роднай мовы сучасны пісьменнік быццам без крылаў! Прыемна, што ў ЛідзіАны існуе асабісты стыль, аўтарка не імкнецца пад кагосьці настройваць свой паэтычны карабель. Яе Ліра вольная і звонкая, па-жаночы пяшчотная, задуменная. На літаратурных сцяжынах яна шукае і знаходзіць трапныя вобразы, адмысловыя, запамінальныя.

Вось, да прыкладу, такія: “Нават кволая травінка, над вадою, высвячала веліч Боскай прыгажосці таямнічага сказання...”, “Снег ляжыць, нібы радно…”, “Пацалаваўшы лысы бераг, таропка крыгі адплылі...”. Альбо вось такі ўрывак з аднаго верша:

Плыве дзядок Дняпро… Гарлачык
Ён песціць хваляй на хаду.
І асаку скубе, няйначай,
Нібы сівую бараду.

Апошнім часам Лідзія Возісава піша і друкуе цікавыя прытчы, у якіх выразна акрэсліліся глыбокі роздум пра існасць чалавека, ягонае месца на нашай зямлі, дзе востра адчуваецца грамадзянска-патрыятычнае гучанне. Асаблівы боль аўтаркі – стан нашага навакольнага асяродку, прыроды, самога чалавека:

...Не кляніце ніколі нікога,
Не зласлоўце, хай ворагі кпяць –
Бо ўсе словы даходзяць да Бога,
А затым бумерангам ляцяць.

Не памылюся, калі скажу, што ЛідзіАна адна сярод нямногіх першых адкрыта піша паэтычным словам пра духоўнасць, рэлігію, Бога. Выказвае свае станоўчыя адносіны да гэтай тэмы, звязваючы з пытаннямі маральнага станаўлення чалавека з вечнымі ісцінамі, якія сцвярджаюцца тысячагоддзямі ў духоўных кнігах.

На мой погляд, у кніжцы “Выток пачуццяў” паэтэса больш смела адчыняе нам дзверы ў свет прыгажосці. Яна запрашае свайго чытача зазірнуць у гэтую цудоўную краіну, каб востра адчуць хараство навокал, нечаканую еднасць чалавека з прыродай. Шмат удалых вобразаў. Вось яны: “Дарога тлустым вужам распаўзлася …”, “Пад вечар завіруха заскакала, спусціўшы пасмы белых валасоў…”, “Зялёны святлафор не загараўся – дождж на чырвоны пешшу закульгаў…”

Творы ЛідзіАны розныя па сваёй тэматыцы, трапяткія, хвалюючыя. Яна штодзённа пашырае свой светапогляд, старанна занатоўвае ў сваёй памяці штосьці новае, неабходнае. Бо яна – сапраўдная працаўніца! І добра разумее, каб

займець павагу, набыць станоўчы аўтарытэт сярод прыхільнікаў сваёй творчасці і годнае месца на роднай Гомельшчыне, трэба быць адукаваным, цікавым пісьменнікам. А па працы, як гаворыцца, і адпаведная пашана. Вось, да прыкладу, у 2007 годзе ЛідзіАна стала лаўрэатам Першага літаратурнага конкурсу імя Кірылы Тураўскага, атрымала Архіерэйскую Грамату ад Беларускай праваслаўнай царквы за паэму-прытчу "Манах". І сёння яна плённа шчыруе, знаходзіць час і для вершаў, і для апавяданняў... У дадзены момант ужо рыхтуюцца да друку ў выдавецтве дзве кніжкі Лідзіі Пятроўны Возісавай. Гэта – "Боская птушка" (эсэ) і кніжка для дзяцей з цікавай назвай "Хованкі". Дарэчы, аднойчы пры сустрэчы з землякамі, паэт Анатоль Грачанікаў сказаў ЛідзіАне: "А табе, Лідзія, трэба больш пісаць для дзяцей. Гэта атрымліваецца ў цябе лепш за ўсё...". Магчыма, ён меў рацыю.

З цеплынёй успамінае паэтэса свайго першага рэдактара – Яўгенію Янішчыц. Добразычлівая, абаяльная, шчырая... Менавіта яна адчыніла дарогу ў прафесійную паэзію – у свой час надрукавала вершы ў часопісе "Маладосць". Потым вершы ЛідзіАны рэдагаваў Анатоль Грачанікаў. А вось рэдактарам першых кніжак стала паэтэса Ніна Шклярава. Вядома, Л. Возісава вельмі ўдзячна гэтым творцам, якія змаглі разгледзець у яе вершах асаблівыя залацінкі...

А яшчэ, "скажу па сакрэту", Лідзія – адказны, пунктуальны чалавек, добры арганізатар творчых сустрэч, юбілейных вечарынаў. І, дарэчы, прывабная, элегантная жанчына, якая вырасціла двух сыноў і дачушку. Сябры па працы памятаюць, як аднойчы пра яе сказаў артыст Юрый Казючыц, які таленавіта сыграў галоўную ролю Васіля ў фільме "Людзі на балоце" (па сцэнарыю І. Мележа): "Лідзія – жанчына з асаблівым, рэдкім шармам". Упэўнена, што ЛідзіАна будзе заўсёды мець свой непаўторны густ і новыя творчыя набыткі. Бо стан яе душы – маладзы, поўны натхнення.

Няхай спраўдзяцца ўсе творчыя задумкі! Няхай зберагае ЛідзіАну Гасподзь!

**ГАННА АТРОШЧАНКА,**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі,
член Беларускага Саюза журналістаў

# Благаславенне чысцінёй

*Зямля – святар, калі дарога*
*Благаслаўляе чысцінёй,*
*І пад канец жыцця да Бога*
*Прасветлена ідзем па ёй.*

## УДЗЯЧНАСЦЬ

Тварцу удзячна ўся прырода:
Аблокі, гай і вусце рэк...
І тут пануе толькі згода,
Не згодны часам чалавек.

Бо ён на Бога наракае,
Маўляў, няроўна падзяліў.
Нячысцік па душы блукае,
Як па далонях мазалі.

Няўцям яму, што сам дарэмна
Зрывае Божухны пячаць.
Схіліўшы голле, нават дрэвы
Пад небам Госпада стаяць.

Усё навокал – прыклад веры,
Любові з даўняе пары, –
Нам адкрываецца ў даверы...
Як перад Богам святары.

## ДОЖДЖ

Абрыдла слёзы ліць па свету
Дажджу і зверху назіраць, –
Зямля змагла пяшчотна лету
Пасцельку мяккую паслаць.

Зямлі хацеў ён быць патрэбным,
Пачуць удзячнасць у адказ.
Дождж расчасаў струменем срэбным
Травы зялёнае атлас.

Бурчала хмарка:
– Ён пакінуў
Такі утульны ў небе трон!..
Маланка сцёбала у спіну,
І бацька-гром кляў наўздагон.

А дождж скакаў і заляцаўся –
Хаця б на ночку да зямлі!
А гром то лаяў, то смяяўся,
То умываўся сам слязьмі.

– Сям'ю наўмысна кінуў нашу, –
Распухла хмара ўся ад слёз...
Зямлю напоўніў дождж, як чашу,
Ажно да самых да нябёс!

## ДНЯПРО

Плыве дзядок Дняпро... Гарлачык
Ён песціць хваляй на хаду.
І асаку скубе, няйначай,
Нібы сівую бараду.

Такі маўклівы ён улетку,
Вясной – радня усіх калюж.
Здымаюць перад ім шкарпэткі
І апускаюць капялюш.

Яго ў Расіі нарадзіны,
А закаханы ў Беларусь!
А вось дачушка – Украіна,
Па бацьку – Кіеўская Русь.

Дняпроўскі род на Беларусі
Высвечвае пяшчотай рук.
І беларускай мовы, мусіць,
Таму ён ловіць кожны гук.

У кожнай кроплі тут – эпоха,
Хоць і ўцякло зашмат вады.
Дняпро нам дадзены ад Бога,
Над ім лунае Дух Святы.

## РЭЧКА ВУЦЬ

Мяне люляла рэчка Вуць,
Гукала плыць удалячынь.
Мне б той час колішні вярнуць,
Паплакаць на яго плячы,

Памерацць хвалі басанож,
Прысесць на беразе ў палын,
Паспавядацца, ды усё ж
Не супыніць рачулкі плынь...

Ды лепш не думаць пра гады,
Якія адплылі ў нябыт.
Іх рэчка чысцінёй вады
Абмыла, як калісьці плыт...

Мне успамін даў зазірнуць
У запаветны той куток,
Дзе ў майго сэрца з рэчкай Вуць
Адзіны маецца выток.

## НАЗВА

Шарпак рабілі каля Сожа,
Пілілі дрэвы ля ракі.
І габлявалі дошкі, можа,
Каб гаць праклясці напрасткі.

Шарпак той быў не для прышэльцаў, –
Для тых людзей, што тут жывуць.
З тае пары ля гаці месца
Усе Шарпілаўкай завуць.

## ЧАРАЦЯНКА

Чарацянка – рай балотны!
Там да неба рос чарот.
Род русалак жыў свабодны,
Ад іх – туташні народ.

Для буслянкі над страхою
Кола легла галышом.
У капліцы, за царквою,
Моліцца святар з крыжом.

Крыж на сонцы промнем грае,
Зіхаціць, як дыямент.
Бацюшку распавядае
Грэшніца пра свой сакрэт.

Людзі, іх жывёла, хаты,
Колькі зведалі часін...
Тут было багоў багата,
А цяпер – Гасподзь адзін!

## ПУХ ТАПОЛІ

Пух таполі ляціць да змяркання,
Кружыць, нібы віхурысты снег.
А над ціхаю рэчкай да рання
Срэбнай стрункаю чуецца смех.

І не стала у сэрцы спакою,
Бо смех звонкі яго пераняў.
А туман, бы каханы рукою,
Асцярожна за плечы абняў.

Пух, ляцеўшы ўсю ноч да світання,
Мне чароўную мрою наслаў...
Пра апошняе з мілым спатканне
Сярод водару кветак і траў.

Дзе гучала, як песня, прызнанне,
Дзе паверыла ў словы яго,
Пух ляцеў, нібы рэшткі кахання...
Я ж хацела яго усяго.

# НАРАДЗІНЫ

*Валянціне Пілiпей*

Да народзін за паўгода
Дрэўца пасадзіла –
Такі даўні звычай роду
Прыбаўляе сілы.

Нарадзілася дачушка –
Цёплай была восень.
Вырай птушак рэха гушкаў
І нябёсаў просінь.

Бог паслаў красу дзяўчынцы,
Не скупіўся ў росце.
Потым шмат другіх гасцінцаў
Пананеслі госці.

Вачаняты, як нябёсы,
Носічак кірпаты,
Макацёр светлавалосы,
Такі, як у таты.

І ці Ганна, ці Алеся –
Ніякай заганы.
Абы лёс табе, як песня,
Быў наканаваны.

– 056152 –
ЦГБ імя А.
Му...
Гомельская гарадская
цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма

# СВОЙ ДОМ

Свой дом, дзе нарадзіла маці:
Цяпло вачэй яе і рук,
Калыскі скрып і печ у хаце,
Дзе першы крок твой, першы гук.

Рушнік, дзе пеўнямі узоры,
Дзе пугай ляскае пастух...
Тут сэрца грэюць нават зоры.
Касцёр Купалля не патух.

Калі свой дом – сваю планету,
Як слова роднае збярог,
Тады ты – гаспадар Сусвету
І творца сам сабе, як Бог!

## ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА

На свята Купалу
я рэха гукала –
Азвалася хорам
Палессе.
За папараць-кветкай
да ранку блукала,
Нібыта вядуння
па лесе.

Здавалася, дотык адзіны
да кветкі
Мяне ашчасліваць
на славу.
Суметы турбот,
нарадзіліся дзеткі,
Жыццё – не гульня,
не забава.

Дзянькі мітусяцца,
як сонныя мухі,
Наведвае свята
так рэдка...
Мне любы аднойчы,
узняўшы на рукі,
Сказаў, што я
папараць-кветка.

Ад слоў тых чароўных
я стала шчаслівай,
Каханаю жонкай,
паэткай...
Дык дзякуй, Купалле,
за гэтае дзіва –
Быць любага
папараць-кветкай!

## КАЛІ Б...

*...Імчыць і мой цягнік,*
*І будзе мой прыпынак...*

Ніна Шклярава

Жыццё – цягнік, дзе год-вагон
Прывабна размалёван кожны.
Пакуль не прышыніўся ён,
З яго яшчэ саскочыць можна.

Каб зноўку сцежкаю прайсці
Цераз арэшнік, праз балота.
Бэз, што паспеў тут расцвісці,
Ад радасці абняць ахвота.

Квітнее ўжо бацькоўскі сад,
Пяшчотна сонца хату грэе,
Якая быццам не старэе,
Бы час вярнуў цябе назад.

Чакае стрэчы агарод:
Не толькі рук тваіх – і слова.
Вунь плот ужо разявіў рот, –
Ты для яго тварыць гатова.

Але ж тут  хочацца маўчаць
І слухаць цішыню, бы маці.
...Калі б памыць падлогу ў хаце
І занава жыццё пачаць.

## З ГОДА...

### *1. Студзень*

Які іскрысты снег пушысты
Лёг на яліны, на зямлю!
Мароз у студзені яршысты,
А я за моц яго люблю.

За музыку хады рыпучай,
За чараўніцтвы на акне,
Што без жалобы даў сыпучых
Сняжынак, быццам шчасця, мне.

Люблю і студзеньскія святы –
Раство Хрыстова, Новы год.
Калі апоўначы дзяўчаты
На лёс варожаць ля варот.

Калі мужчыны і кабеты
У дзень Хрышчэння ля вады.
Там, дзе прычасце і абеты,
Дзе  споведзь, там і Дух Святы...

### *2. Люты*

Зіма усё запаланіла,
Заслала, выветрыла ўраз.
Мяцеліца святло закрыла,
А ты святла чакаў якраз.

Зіма лютуе і злуецца,
І стогне, нібы ў клетцы звер,
Марозам скоўвае азерца,
Але цяпло жыве у сэрцы,
А разам з ім жыве давер.

### *3. Сакавік*

Вясна глядзіць блакітным вокам,
Слязою бруднай плача снег.
Вясёлкай грае ўсё навокал,
Ручай не стрымлівае смех:

Трава ваду п'е з асалодай,
Свавольны грак казыча ў бок!
Уся прырода пахне згодай.
Сок, як прычасце, даў Сам Бог.

Пацалаваўшы лысы бераг,
Таропка крыгі адплылі.
Ім моўчкі выбеглі наперад
Барозны восеньскай раллі.

Калі ж уцёк мароз са сцюжай,
Забарабаніў моцны дождж.
Расплыўся след і стаў калюжай –
Вясна тут стала басанож.

### *4. Красавік*

Красавік лісточак клейкі
Фарбаваў, нібыта вейкі,
У зялёны колер годны –
У вясны стыліст ён модны.

Красавіцкі густ – знак года:
Прачынаецца прырода.
І пупышкі набрыняюць,
Бы куфэркі адчыняюць.

І лазу, нібы паненку,
Апранаюць у сукенку.
Да зялёнага адзення
Першацветы – аздабленне:

Жоўты колер, сіні, белы…
Красавік надзвычай смелы:
Холад ён змяніў, трывогу
На цяпло.
На радасць Богу.

### *5. Май*

Сушыць лысіну на ветры
Поплаў, нібы дзед стары.
Пахне бэзам у паветры,
Бы цырульня у двары.

Паслухмяная жывёла
Чарадой прыйшла на луг.
Казялец сцяблінкай кволай
Гнецца, дзе прылёг пастух...

Ні тумана-сырадою,
Ні хмурынкі над Дняпром.
Стрыж маланкай над вадою –
Грукаціць здалёку гром.

Бульба цягнецца спрасонку,
Зелянее агарод.
Май прыродную скарбонку
Першы поўніць кожны год.

*6. Чэрвень*

Дрэвы зелянеюць
Ля пяшчотных плёсаў.
Дзе сады квітнеюць, –
Водар да нябёсаў.

Шпак на вершаліне
Салаўём спявае,
Вусень на галіне
Лісце есць, глытае.

Вочкі адкрывае
Птушка на хвілінку:
Вусеня хапае,
Нібыта расінку.

Трэлі поўняць зранку
Сад майго суседа, –
З песняю да ганку
Прыляцела лета.

*7. Ліпень*

Лётае бусліха,
Як анёлаў маці.
Крылы яе ціха
Сталі ахінаці
Родны свой куточак
З кветкамі у лузе,
Склалі што вяночак
Любай Беларусі.

Лета, сонца, спёка…
Даўганогай птушкай
Пад бацькоўскі клёкат
Цешыцца дачушка.

Сонейка залоціць
Неба Беларусі.
Спадаром абходзіць
Край свой татка-бусел.

***8. Жнівень***

Жнівень сонечны, багаты.
Садавіна вакол хаты –
Ёсць і яблыкі, і слівы…
Бульбай радуюць нас нівы.

Жнівень шчодры і вясёлы,
Бо частуюць мёдам пчолы.
Птушак ён рыхтуе ў вырай,
Сустракае восень шчыра.

Жнівень – дыпламат пры стрэчы.
Першым восені, дарэчы,
Дорыць поўны капялюш
Сакавітых спелых груш.

Жнівень збожжа жне, малоціць,
За надвор'ем пільна сочыць.
Працаздольны, не лянівы,
Жнівень – гаспадар руплівы!

### *9. Верасень*

Каб пабегла са двара
Хутка ў школу дзетвара –
Верасень прыдумаў гэта.
Песню адспявала лета.

Месяц верасень упарты:
Пасадзіў дзяцей за парты.
Потым свеціць праз аконца,
Валаводзіць промнем сонца.

Цёплы верасень і росны.
Павучкам развесіў кросны:
Павуцінкі-гамакі,
Дзе лятаюць павукі.

Ноччу холадам пужае,
Днём – на зборы ураджая,
Лёг туманам ля ракі –
Верасень заўжды такі.

### *10. Кастрычнік*

Мастак-кастрычнік захацеў,
Каб лес ля рэчкі пажаўцеў.
Нібы дызайнер-баламут
Расфарбаваў свой родны кут.

І неба стала шэра-сінім.
Карункавым – бялюткі іней.
Траву кастрычнік апранае –
Ёй дрэва кветку-ліст скідае.

То ярка-жоўты, то зялёны,
Барвова-охравы, чырвоны.
Мазкі вясёлыя бясконца –
Кастрычнік любіць фарбы сонца.

Рудыя толькі – сенажаці.
Замоўклі птушкі каля гаці,
То холад, то цяпло, то ветрык…
Застыў кастрычнік у паветры.

***11. Лістапад***

Каля азёр, наўскрай гаёў
Як быццам водбліскі баёў!
Там промні воблакі фарбуюць
У золата, нібыта збрую
Нябесна-шэрага каня,
Які хвастом змёў рэшткі дня
У пашчу ненажэрнай ночы,
Аблокамі прыкрыўшы вочы.
З-пад чорных веяк пазірае
Ноч, выпусціўшы, нібы з рая,
У жудаснае чараўніцтва
Прывід вэлюмавы: ён быццам
Бадзяецца – худы, цыбаты,
Як цень ад дрэва, каля хаты.

### *12. Снежань*

Дарога тлустым вужам распаўзлася,
Ліхтар перапалохана мільгаў.
Зялёны святлафор не загараўся –
Дождж на чырвоны пешшу закульгаў.

Як ад хваробы зморшчыўся мой горад –
За гэты дзень ён стаў нібы стары.
Споўз брудам снег сівы, як быццам гора,
Разбушаваўся вецер на двары.

І скрозь імжу кідаў сняжынкі жменяй,
Нібы хацеў дарогу астудзіць.
Дажджынак сумных капала ўсё меней –
Не змог дождж асяроддзе абудзіць.

Пад вечар завіруха заскакала,
Спусціўшы пасмы белых валасоў
Аж да зямлі. Яна гула і звала
Мароз на свята сотняй галасоў.

І пераможна горад засмяяўся,
Шчарбаты рот сняжынкам падстаўляў…
Так Новы год з мінулым забаўляўся
І чысцінёй людзей благаслаўляў.

# *Штрыхі Сусвету*

*Генію, цару, паэту –*
*Гонар, слава ды напасці...*
*Непатрэбнае Сусвету,*
*І ў магілу не пакласці.*

## КАБ ВЕДАЦЬ...

*...Дзяўчынцы хочацца ў паэты,*
*Бы ў катаржанкі...*
*Дзе ж ёй знаць!*

Я. Янішчыц

Мінск. Кабінет. Вялікі стол.
Сядзіць рэдактар "Маладосці" –
Паэт Грачанікаў Анатоль,
Яго калегі і мы – госці.

Тут Ніна Шклярава якраз
Мой ложыць рукапіс Янішчыц:
– Глянь, вельмі ж хоча на Парнас,
Шкада жаданне тое знішчыць...

Танклявая нібы дзяўчо,
Свяцілася вачэй блакітам...
Кранула Жэня за плячо,
Пакінула ў душы адбітак.

Камейша праз хвіліну знік,
Ляцеў ён некуды... Каб ведаць!
А Далідовіч, той прывык
У гэты час заўжды абедаць.

Было утульна нам, гасцям,
Нібы радню хацелі бачыць
Апошні раз...Было няўцям,
Што так і ёсць,
Не перайначыць...

## ПАЭТУ

*Анатолю Грачанікаву*

Паэтычны твой век
Прамянём у акне:
На зямлі жаўруком
Наспяваўся ад сэрца.
Засталася навек
Тая песня ва мне,
І жывым раўчуком
Па радзіме ільецца.

Развярэдзіў нутро
Шчырым словам…Прабач…
Але з кожным радком,
Што пакінуў ты людзям,
Ажывае дабро,
Што злягло ад няўдач.
І рунее ізноў,
Выспяваць яшчэ будзе.

Твае вершы усе
Нібы вуліц агні,
Бо ад іх цеплыня
На душы і у хаце.
У вясновай красе
Слова роднай зямлі,
Мабыць, ад наслання,
А мне – зёлка у садзе.

## ПУПАВІНА

*Ніне Шкляравай*

Даўно б змяніла ты свой лёс,
Але да Беларусі мілай,
Узняўшы вочы да нябёс,
Ляціш здзівіць радзіму лірай.

Сумуе сэрца па Сажы?
Ці зноў сяброўкі ўспамінаюць?
Мо, родных могілак крыжы
Цяплом былога абдымаюць?

Тут памятае кожны збан
Матулі голас, крок твой першы…
Магчыма, гэта Божы план –
Тут нарадзіць дзіця і вершы.

Напэўна, быў бы іншым лёс,
Здаецца, у славе жыць павінна…
Цябе ж трымае, нібы трос,
Зямелькі роднай пупавіна.

# З ДЗЯЦІНСТВА

*Яўгену Калашнікаву*

Сярод кветак стракаціць зялёны
Конік, скача, быццам у раю.
На талерцы агурок салёны
Славіць бочку любую сваю.

Месяц сцеражэ свой невад-хмары,
Каб Пегаса ухапіць за хвост.
Для паэта конь – здзяйсненне мары,
Ці ў дзяцінства крышталёвы мост.

Дрэвы – нашы мудрыя дарадцы,
Іх жыццё даўжэй, чым у людзей…
І віруе верш, нібыта ў казцы –
Смехам звонкім шчыра ля дзяцей.

## ХАЙ УСЯВЫШНІ ЧУЕ НАС

*Алене Алешыне*

Ці так даўно сямнаццаць год
Спраўляла маміна дачушка.
Вось і твае гады, як птушкі,
А потым – нібы карагод.

Няхай жа задуменны час
Пакіне ў сэрцы летуценні.
Журбу разгоніць і сумненні,
Хай Усявышні чуе нас!

Табе насустрач хай ідзе
Хлапец, душой і сэрцам шчыры,
І прыжывецца між людзей
Радок тваёй натхнёнай ліры.

## ВЕРШ ВЫСПЯВАЎ...

*Л. Раманавай*

Мазок, мазок… Яшчэ штрышок…
Збіраю словы на старонках…
Нібы сама пішу… Штуршок,
І сэрца поўніць вершаў гронка.

З тае галінкі, што мастак
Намаляваў…А фарбы неба
Браў на зямлі паэт-дзівак.
Верш выспяваў, як бохан хлеба.

Праз слова ззяе каравай
Жыцця людскога на паперы.
Прашу, паэт, благаслаўляй
Надзеі промнем, словам веры!

## З ГОСПАДАМ...

*А. Сысу*

З Госпадам паэтаў небагата.
Хтосьці, як анёл, цябе сустрэў.
Прадчувала адыход твой хата,
Слёзы капалі з галінак дрэў.

Адляцеў, як птах насустрач лету.
Тут прайшоў на вернасць свой урок.
Адчуваў сам сэрцам хвалю гэту,
Бо праз верш нам гаварыў прарок.

Калісь мы ўзляцім да паднябесся,
Падуладным стане ўвесь абсяг.
Беларусь, ці чуеш, сына песню
Лебедзь белы ўжо нясе ў грудзях?!

## РЭЦЭПТ

*...І голы месяц у аблоках*
*Катаўся, як у масле сыр...*

Н. Шклярава

Паэт сярод людзей не памірае,
Бо ля яго зайздроснік цэлы век.
То ганьбіць верш, то кпіны пасылае,
Не ведаючы, што сабе на здзек.

Без зайздрасці яму, нібы без хлеба,
А хлеб паэт на славу замясіў.
Рэцэпт даслаў анёл з самога неба
Праз травы, што малітвай арасіў,

Праз водар кветак, што разнеслі пчолы,
Праз кладку, што спусцілася ў ручай
(У ручаі гайдаўся месяц голы),
Паэт з вады тае настойваў чай.

А што зайздроснік? Ён – крупінка солі,
А з ёю смак адчуеш найхутчэй...
І хопіць пра няўдалае – даволі,
Калі Пегас у водбліску вачэй!

# НЯБЕСНЫ ВОДБЛІСК

З паэткаю нялёгка жыць:
Умела ўброд ісці праз рэчку –
Пранесць, дзе вадаспад імжыць,
Запаленую Богам свечку.

Імкліва, каб не загасіць
Нябесны водбліск выпадкова…
Свяча пагасне – галасіць
Душа пачне яе без слова.

Любоў з натхненнем берагчы
І слова трэба. І паэтку,
Як на Купалле уначы
У лесе знойдзеную кветку.

Бы перакласці верш яе
На музыку!
І з асалодай
Пачуцці перадаць свае
Праз песню найвышэйшай нотай.

…З паэткаю цікава жыць!

## КАЛЯ ПАЭТА

Каля чужога гора плётак зграя,
Падай яму хутчэй руку сваю!
Бо толькі дужыя дапамагаюць
Не ўпасці ўніз, калі хто на краю.

Сапраўдны сябра радуецца шчыра
Узлёту, новым творам сябрука,
Бо разумее: рог багацця – ліра,
Дзе не бяднее Боская рука.

А хто зласловіць за спіной паэта,
Падобны на зайздросніка, найперш,
Бо ўжо не ён увагаю сагрэты,
А творца і ягоны новы верш.

І прыйдзе час, Бог з намі загаворыць,
Пакуль жа ён шчыруе над зямлёй…
А чалавек уласны лёс сам творыць:
Хто – вершам, хто – падтрымкай, хто – хлуснёй.

## КРЫТЫКУ

1

Калі мой вершык вам не раз
Навее зайздрасць ці трывогу,
Скажу:
– Пішу я не для вас,
Мо, супакоецеся троху?

Вы словы, як сляпы пастух,
Стапталі – козы не пад'елі.
А мой каханнем дыша рух,
Мелодыя бы на вяселлі.

Лячу я вершам не да вас,
Лячу туды, дзе летуценні,
Дзе Бог стракае кожны раз
Тых, хто з малітвай на каленях.

2

Не чытаў, сказаў: “Пасрэднасць...”
Вершы – стан маёй душы…
Няма ж зайздрасці –
На беднасць
У сваёй не адкажы.

3

А ўсё-ткі крытыкаў люблю!
Бо слова кожнае лаўлю…
Я сэрцам чую голас ваш,
Радок шліфуючы не раз…

## БАРД

Хто кпіў з Высоцкага Валодзі,
Як не памёр, то пастарэў.
А хтосьці енчыць пры народзе,
Як сябра, бардаўскі прыпеў.

З паэтам – праўда, небыліцы,
За вершамі легенд віток.
Нібы з нябеснай калясніцы
Нядаўна нам спяваў прарок.

Для цемрадзей быў прыцягальны.
Ды пры святле не блытаў іх…
…Агонь палае памінальны:
І я – іскра яго,
Ці міг?..

## ДЗЕ ДЗЯЎЧЫНКА…

*А. Пушкіну*

Дзе дзяўчынка з ціхай вёскі,
З кніжкай Пушкіна ў руцэ?
Толькі часу адгалоскі
Патанулі у рацэ.

Знікла з памяці прывідам
Кніжка даўняя, найперш.
Засталася, не забыта
Казка Пушкіна і верш,

Дзе вучоны і разумны
Ходзіць кот па ланцугу…
Час прайшоў, нат крыху сумна:
Як бабуля ўжо магу

Вершы Пушкіна нанова
Я з унукам зноў вучыць.
Праз гады паэта слова
Ў хаце нашае гучыць.

## СКРЫЖАЛІ

*Валянціне Ткачовай*

Здаўна́ пісьменнікі, паэты
Пісалі п'есы і санеты, --
Свае пачуцці узвышалі –
Аб гэтым сведчылі скрыжалі.

Цяпер дзяўбці на камні словы
Прарок сучасны не гатовы:
Для малатка і долата
Няма паэта-волата.

Калісь жанчына рыфмавала,
Ды памяці не давярала,
Мужчына ўвекавечваў гэта
У камені і… стаў паэтам.

Граніт дзяўбаўшы, стаў як скульптар,
А праз вякі зрабіў камп'ютэр.
Цяпер пісьменнік наш адзін,
Не заўважаючы гадзін.

Дзяўбці, як дзяцел, клавіш мусіць
Заўважыць жонку не прымусіць,
Бо ўсе раманы, п'есы, оды
Пісьменнік піша для народа…

Мінуў далёкі час, на жаль,
Камп'ютэр зараз, як скрыжаль:
Ён замяніў сям'ю, каханку,
Якая спіць адна да ранку.

…У век каменны заўважалі:
Сям'ю ўмацоўваюць скрыжалі!..

# ВЯНОК

*Ганне Атрошчанка*

У ткацкай працы ёсць аснова,
Каб рушніку узор надаць.
А вось аздобіць думку словам,
Нібы маланку зацугляць.

Энергія, што тоіць слова,
Людзей вяла, мяняла час,
Гаючаю рабіла мову,
Уладарамі мовы – нас.

Тканіна верша непаўторна,
Вось прымаўкай радок зіхціць…
Раптоўна загучыць валторнай,
То ажно дыскантам звініць.

Бывае, слоўка на паперцы
Лунае, птушкаю ляціць.
Другое, як маланка ўеcца,
Не кожны зможа ухапіць.

Як цела вялае без крока,
Без мудрасці – нішто гады.
Выток, калі няма прытока,
Засохнуць можа без вады,

Як сохне без дажджу расліна,
Ці як без вобраза радок…
Верш для паэта – пуцявіна,
Ягоны лаўравы вянок.

# Вэлюм веры

*Штодзённасць нівеліруе вялікасць:*
*Вялікасць чэзне. І сучаснасць пройдзе...*
*Любіць штодня і з сілаю вялікай –*
*Адзіны шлях.*
*Належыць ён свабодзе.*

## СКРЫЖАВАННЕ

Маё распяцце – крыж жыцця!
Гляджу, нібыта з небыцця
Ці збоку, як анёл бяскрылы
Ля бездані чужой магілы.

Дзве перакладзіны распяцця:
Матэрыяльнае багацце
І шлях духоўны ў паднябессе
(Як мець унізе, што і ўверсе?).

Я на крыжы – распяты рукі,
Заміж цвікоў зямныя мукі:
Багацце, беднасць і спадман,
Дзе плётак з крыўдаю дурман…

Ды ў неба крыж глядзіць прадвесні:
На ім каханне! І, як песні,
Жалоба, радасць, міласэрнасць,
Малітва, прыгажосць і вернасць.

І зайздрасць звісла лахманамі.
Вунь бруд сцякае між ступнямі,
Якому у калюжы месца.
На скрыжаванні – маё сэрца.

Трымае неба і зямное,
Нібыта на крыжы нас двое.
І вочы колеру нябёсаў
Аддалі волі Бога лёс свой.

Памацаць як гадоў хвіліну?
Каб бегла, хто мне пхае ў спіну?
Час на руках мяне імчыць –
Дзе слова роднае, спыніць?
За кроўнае як учапіцца
І за Радзіму памаліцца?

# УЗОР ЧЫРВОНЫ

*В. І.*

Чырвоным крыжыкам на ўсё жыццё
Узор, што вышыла. З ім адкрыццё
Прыкрытай ганьбы, зайздрасці, znявагі
І плётак, што звісалі, нібы сцягі.

Брыдота той узор пааплятала,
Ды, высахшы, ушчэнт паадлятала.
Бо не знайшла падтрымкі ля людзей –
Маўчалі ўсе, калі крычаў зладзей.

Назад брыдота каменем паўзе.
І боль па ганьбаваўшага назе
Ударыла, напоўніла ўспамінам.
Усё ўсплыло, што ёй кідаў у спіну.

І ажылі Хрыста такія словы:
"Ці кінуць камень у яе гатовы,
Калі не грэшны хто?.."
Зладзей грашыў.
Чаму ж яе судзіць за ўсіх рашыў?

Бо славы не заўважыла ў той час,
Калі ўсхвалялі і яго не раз.
Усё маўчала... Як сапраўдны здзек,
Яе маўчанне памятаў ён век!..

Яна ж ахутана вэлюмам веры
І перад кожным адкрывае дзверы,
Дзе сустракае толькі мовай роднай.
Бо бачыць Беларусь краінай годнай

І вельмі шматпакутнай, і святой...
У свеце на слыху і імя той.
Ёй нават падуладная мяжа.
...Яна ж у ног Хрыстовых ля крыжа.

## ЁН І Я...

Мы з двух краін. Няма для нас
Мяжы, каб Богу памаліцца.
І пры сустрэчах кожны раз
Вачыма і душой адкрыцца.

Ён у Расіі, за мяжой…
Радня сюды заве, як брата.
Пры развітанні, са слязой,
Славянскіх слоў гучыць багата.

Мой родны старажытны сцяг
Чырвона-белая аснова
Расійскага. Раства працяг –
Да каранёў агульных – мова.

Ён моліцца за Беларусь!
Каханне наша – подых сілы,
Што падымае лёсу груз,
Каб я ляцела да Расіі.

…Зямля крывавіць тут і там,
Палохаюць, як раны, межы.
Я сэрца за любоў аддам,
На мове Старажытнай Вежы.

## СТРЭЧАННЕ

Ноч поўны месяц закаціла
За хвост падлеску, за Сажом.
З усходу сонца асвяціла
Кут беларускі, як крыжом.

Адзін прамень, прадвеснік стрэчы,
Жывіў Хрыста Ісуса твар.
Малітваю маўклівай свечы
Ахоўвалі Сусвету дар.

Пра Стрэчанне напамінала
Гадамі сэрца з верай той,
Каб, дзе алтар, успамінала
Імя Радзімы, як святой.

Жыццё, праяўленае сёння,
Як выспеласць душы маёй:
Прасветленай – часінай цёмнай.
Пад воляй Боскаю Тваёй.

Яскравая малітва тройчы
Ачысціла душу ізноў.
Ступні Твае цалую, Ойча:
Святло я ўбачыла, любоў,
Удзячнасць, мір і невядомасць.
На свяце Стрэчання з Табой
Тут Беларусь, Яе свядомасць –
Дачкой Тваёй быць, не рабой.

*15 лютага 2006 года*

## СОН ПРА ХРОНІКУ ЖЫЦЦЯ

Тут толькі свет і мноства красак,
Дзе крыж з распятаю Душой –
Ля ног якой дзівоцтвы масак.
Тут голас вешчы за мяжой…

– Глядзі, усё як на далоні,
Між кадраў хронікі жыцця.
Адчуй – на матчыным улонні
Быў першы крок, крок забыцця:

"Вельмі малы пра Бога думаць,
Хай лепей вучыцца той час!"
…Ды хутка вырас сярод тлуму,
Быў голас тонкі, стаў як бас…

…Вось ён узнёслы, закаханы,
Занадта спакушаў, як мог.
Вунь за плячыма чорт з рагамі –
Уцёк, як пальцам тыцнуў Бог.

…Сям'ёй і працай вось заняты,
Зноў не прывёў да Бога шлях.
Жыццё як лук, стралком напяты –
Ва ўнуках бачыць свой працяг.

…Задужа стаў старым і хворым,
Слабыя ногі ледзь ідуць.
Пра Бога б думаў, каб здаровы…
…Вунь і на могілкі нясуць.

"…Залішне позна, дужа позна!" –
Усведамленне ў галаве.
Прачнуўшыся, шчэ мовіць можна:
"Анёл, дай шлях да Бога мне!"

## МАЎЧАННЕ

Бацькоў дзіцяці разумее,
Калі іх слухае – маўчыць.
Разгублена яно нямее,
Як маці лаецца, крычыць.

Аберагаюць дні і ночкі
Сям'ю анёлы ўсё жыццё.
Таму святых шануем моўчкі
І вучым гэтаму дзіцё.

У лазні моўчкі мы змываем
Бруд з цела. Вось бы так з душы!
А крыкам пекла адкрываем
Так, што назад не пабяжыш.

Маўчаць на пахаванні трэба,
Бо нельга крыкам рады даць.
Душу завуць анёлы ў неба
І вучаць з імі там лятаць.

Калі сапраўднае каханне,
Ад шчасця хочацца маўчаць,
Бо вочы свецяцца прызнаннем,
І струны радасці гучаць.

Душа і цела – храм для Бога.
Ды моўчкі ў храм заходзіць Бог.
Суцішся, як скуе трывога,
Каб завітаць у храм Ён мог.

## ПРЫКМЕТА

Стагнала высахлае лета,
Трос чубам выспелы авёс.
Да хаты, пачуццём сагрэтай,
Дзівак-анёл дзіця прынёс.

Калі ад зоркі выпадкова
Люстэркава прамень мігнуў,
Крылаты конь сваю падкову
Згубіў, анёл якую гнуў.

Хоць недарэчная прыкмета,
Ды Бог дае, калі прасіць
І верыць: да падковы гэтай
Анёл на помач прыляціць.

У хаце той ляжаць падкове
На шчасце і ад наслання.
Тут моліцца на роднай мове
За Беларусь уся сям'я.

## МРОЯ

Хлеў расчыніў шырока дзверы –
Сняжынкам бык падставіў рог.
І сена гаспадар без меры
Наклаў амаль што цэлы стог.

Жывёліне казыча ноздры
Засохлы сіні васілёк…
Закрылі хлеў. Нібыта коўдра,
Духмяны водар лёг пад бок,

Быку напомніў дзень вясновы:
Пад сонцам кветкі у траве
Зрываюць языком каровы,
Ён статак галасна заве.

Стрыкочуць конікі наўкола,
Усыпаў поплаў казялец.
На шыі гладкае жывёлы
Звініць званочак-удалец.

Не брэша, задрамаў сабака,
На ўзгорку спіць пастух-крыкун.
Ляжыць здранцвелы, як вужака,
І сцеражэ кароў бізун.

Дамоў з бычком пад вечар шэры
Вядзе бык статак – побач сын…
Зноў рыпнулі хлявочка дзверы,
Знік за вароты успамін.

## ВЕРШНІК

Галопам пранесліся коні,
Гучыць адгалоссе падкоў
Ад песні, спявалі што воі,
Праз рэха святое вякоў.

І мроіцца вершнік у латах,
Меч востры, харугвы і конь.
У гімне ўсе словы-зярняты –
З малітвы Хрыстовай агонь.

Ляціць акрылёна пад сцягам,
Вякі абганяе і час.
Ён роднае мовы пасагам
Яднае у вечнасці нас.

Мільгаюць абшары і гоні,
Наперадзе свету абсяг…
Нашчадкам нясе смелы коннік
Гісторыі нашай працяг.

# Гарчыць сляза

*Душа, як птушка, узнясецца...*
*Нішто – цялесныя аковы.*
*Любоў-пасаг хавала сэрца*
*У вечны шлях, як крыж аховы.*

## ЗНАК

Слуп, пачарнела дошка,
Абнесеная дротам,
Пакінутая вёска
Ля сэрца ўсёй Еўропы.

На дошцы ледзь прыкметны
Знак могілак чырвоны –
Радыяцыйны  сметнік.
Але ж жывуць вароны.

На неба пазірае
Адзіным вокам студня,
Над цэбрам замірае
Апошняй нотай лютня.

Ляцелі адгалоскі
Радыяцыйным кропам
Па-над іржавым дротам,
Над кінутаю вёскай
І над усёй Еўропай.

## СТАРЫ

Струхнела яблыня у садзе,
Дзядуля вырашыў спіліць.
Ды ўсю зіму сядзеў у хаце:
То холадна, то штось баліць.

У маі з саду – пах мядовы,
Чаромха тут ва ўсю моц цвіце!
У сад дзядуля стогадовы
З пілой да яблыні ідзе.

Упала яблыня са стогнам,
Пад ёю хруснуў згніўшы тын.
Адкінуўшы пілу, свабодна
Стары, сагнуўшыся, застыў...

## ПАМЯЦЬ

Крык апошнім быў?
Малітвы словы?
Хто сустрэў яго? Анёл? Гасподзь
Сам гаворыць з ім на роднай мове,
Дабраславіўшы душу і плоць?

Як вясной пра песню жаваронка,
Ведалі анёлы пра адлёт.
Там яго ўжо сустрэла жонка.
Тут пакінуў прашчураў – свой род.

Ля труны разгубленыя дзеці,
Як старыя, дзеляцца слязой.
Кветкі, медалі, святар, суседзі...
Смерць сама з нязменнаю касой.

Крык быў першы.
Крык быў і апошні!
Лёгка адышла яго душа...
Ля магілы зелянелі пожні,
А у храме па душы – імша.

## ГАЛАШЭННЕ

– Любы мой сыночак,*
Сізы галубочак,
Дужы мой асілак,
Паглядзі з магілы.
Як сышоў з парога,
Не было трывогі,
Што будзеш аднойчы
Ты ў палоне ночы.
Падзівіся, мілы, –
Зараз ля магілы
Плачу, твая маці,
Плакаць мне і ў хаце:
"Я ж цябе любіла,
Я ж цябе расціла,
Чаму ж табе міла
Гэта ночка стыла?
Я той ночкай спала,
Ты прабач мне, дзетка,
Побач не стаяла,
Малілася рэдка...
Дай жа, Божа, крылы,
Каб сыночак мілы
Паляцеў анёлам
Над лясамі, сёламі,
Над садам, над хаткай,
Там, дзе родна матка
Моліцца і плача,
Сына больш не ўбача..."

*Варыянт галашэння пры пахаванні нябожчыка ў в. Зэфельд Добрушскага раёна.

## НА ПАХАВАННІ

Назад, да роднага парога,
Нябожчыка заве, крычыць
Радня, хаця і верыць Богу,
Ды з гора плача, не маўчыць.

Ні рады не дае, ні сілы
Адчай засмучаных хвілін.
Маўчыць уся ў вянках магіла,
Гарчыць сляза, нібы палын.

Нябачны свет зямному зроку
Цяплом анёльскім ахінуў.
Ён падуладны толькі воку
Нябожчыка, што тут заснуў.

Яго душа сярод паэтаў,
Я іх па крылах пазнаю.
Ля мора, што завуць Сусветам,
І я акрылена стаю.

## АБРУС РАДЗІМЫ

Не слухаю расказы пра вайну –
Радзімы сэрца ўсе стагоддзі ў скрусе.
Нягоднасць, жорсткасць, злосць і ўсю віну
Яно спасцігла пры Хрысце Ісусе.

Хто стаў Хрыстом распятым на вайне?
Напэўна, кожны трэці ў Беларусі...
Той іскры Боскай не дано гайне,
Схавана іскра ў матчыным абрусе...

## ПРАДЧУВАННЕ

Дадзены нам запавет:
Кожнаму – сваё! Да скону.
Пазіраем на Сусвет:
Падуладна ўсё Закону.

Адчуваем – на Зямлі
Бестурботна жыць не трэба!
Не чапляцца за камлі,
Калі спакушае неба.

Ведае каля крыжа
У малітве наша сэрца:
Блізкі час, калі душа
Птушкай белай узнясецца.

## ЗАПАВЕТ

Утапіцца б не змагла, бо бегла
Я на хвалях ветра ўсю адлегласць.
Не змагла б разбіцца, каб упала, –
Крылы за спіною адчувала.

Як маланка з аглушэннем біла –
Засталася чараўніцтва сіла,
Адчуванне, што агонь ад Бога
Калісь прыйдзе да майго парога.

І ўзляціць душа вышэй, чым гусі,
Ад матулі роднай – Беларусі,
Пеставала што, мяне расціла.
Ёй агонь мой трэба, не магіла.

Незнаёмец, сябра, ці наследак,
Маё слова гэта напаследак:
Дровы скарыстай тады, салому.
І спалі – хутчэй вярнусь Дадому...

## СЛОВА

Здаўна лічылі: Бог – у слове!
Ягоны Дух стаў на мяжы,
Даў накірунак роднай мове
Ля бездані, сярод імжы.

Па слову сябра разумеем,
Нібы каханне праз пагляд.
Ад слова здзіўлена нямеем,
Бяжым насустрач ці назад.

Любоў у сэрцы памірае
Ад здрады і нядобрых слоў.
Жыццё праз слова нас карае,
Як Боскіх не глядзім высноў.

Праз слова аб'ядналі душы.
Знявагай раз'ядналі іх.
Будуем словам, ім і рушым...
Ды лепш стрымаць гняўлівы міг!

Вось злоўжываем словам Боскім –
Нячыстай маткаю клянём...
Суд над труною адгалоскам,
Той суд і ў сне не прамінём.

*“Адзін – плача,*
*другі – скача...”*

**Дзед Атрох**

# *Аўцюкоўская лічылка*

*Бывае, і Сусвет жартуе*
*З прыродай, нетрамі зямлі...*
*А нам – характар жарт гартуе,*
*Каб крыўду прабачаць маглі.*

## ПЧАЛЯРУ

Воблік твой, як мары прывітанне –
Сцішылася, каб адчуць каханне.
Пуста ў сэрцы – струны не зайгралі,
Жудасна, нібы ў забытым гаі.

Ты казаў, пчалой ляціш за мною?
Вось і прынясі мядку ад рою,
Што каханнем пахне, сонцам, летам,
Мо, хоць гэтым буду я сагрэта.

Каля рою ты не труцень, бачу,
Бо па выхадных ляціш на дачу...
Мяне любіш вельмі?
Я паверу,
Калі лягу вершам на паперу.

## ТРЫНАЦЦАЦЬ

Трынаццаты прыпынак на Карачаў.
Як помню, не хацеў ён ад'язжаць...
Мы аб мінулым, слаўны Бранск, не плачам –
Навошта, што памерла, ўваскрашаць?

Трынаццатага жніўня. Ружы-кветкі...
Дзень нараджэння любага. І я.
Фарбуе ярка памяць лічбы-сведкі,
Крылатаю была любоў мая!

Трынаццатае. Зноў аўтобус.
Мой Гомель. Хочацца смяяцца:
Як ні круціўся многа глобус, –
На Бранск прыпынак.
Зноў трынаццаць.

## САБАЧАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Сабачае вяселле у разгары –
Па вёсцы радасны і гучны брэх.
Так гаўкаюць каля адзінай пары,
Што ўрассыпную вераб'і з-пад стрэх.

Сабачае каханне, як імгненне:
Панюхаў, аблізаў, хутчэй дамоў.
Ашчэніцца без бацькі пакаленне...
...А людзі ўсё пра вечную любоў!

## СПАТКАННЕ

Вечар прадзімае грудзі,
У вакзал спяшаюць людзі.
І яна сюды ляцела,
Сэрца соладка трымцела,
Выраслі, здаецца, крылы,
Бо яе чакае мілы.
А мароз, праз шэпт, жартуе,
Вусны, нос і лоб цалуе:
– Ты баялася спазніцца?
Вось і стой адна, дурніца,
Нібы помнік цэлы век.
Дзе ж твой любы чалавек?
...Дваццаць год прайшло. І смела
Зноў прыйшла, дзе скамянела:
Ён чакаў цяпер з букетам,
Ёю жыў зімой і летам...
Паўсміхалася ў адказ:
"Што зрабіў з табою час!"
Праз гадзіну скажа дома:
"Не спатканне – адна стома!"

## ОЙ, КАСТУСЬ

Ой, Кастусь, прывабны Косця,
Смелы, канапаты...
Я не звала цябе ў госці,
Сам прыйшоў да хаты.

Кажаш, што лятаеш птахам
Ка мне сцежкай вузкай.
Ездзі на машыне шляхам,
Хлопец беларускі.

Коратка сказала Косцю
Ля сваёй крыніцы:
– Доўга ходзіш сюды штосьці,
Як да маладзіцы...

Піў ваду, нібы святую,
Піў нібыта зелле.
Ды сасватаў маладую –
Вось шуміць вяселле!

Ой, Кастусь, каханы Косця,
Мілы, канапаты.
Ты мяне вязеш не госцяй –
Жонкаю да хаты.

## НОЧ У ДАРОЗЕ

Блукаюць думкі па вагону,
Нібыта здані, ходзяць сны.
Яны па-нейкаму закону
Вірують, бы ў вадзе ўюны.

Над цягнікам лунаюць душы –
Узлёт нібы з апошніх сіл.
Я здагадацца толькі мушу:
Яны імкнуць пад небасхіл.

Сваю ж душу я прывязала
За вершык дужа маладзы.
Нібы ўсю ночку мне кувала
Зязюля зоўсім не гады.

Імчыцца слоўка з-пад алоўка,
Душа гатова ўслед на ўзлёт...
А побач спіць мая сяброўка –
Храпе, як леў, раскрыўшы рот!

## ЗДЗЕК

Жонка пакахала
Іншага мужчыну.
Мужу горка стала,
Тыдзень піў з кручыны.
Безумоўна, з тлушчу
Бесяцца кабеты.
Як бы збегчы ў пушчу,
Здзек не бачыць гэты?
Зараз як ільдзіна
У грудзях застыла,
Кожная гадзіна
З жонкаю няміла.
Вопратка ляцела
Жонкіна з той хаты:
Нат спіна ўспацела
Мужа, нос кірпаты.
З крыкам папракае:
– Спіўся, не працую?
Не адна такая –
Лепшую знайду я.
З п'яным ноч няміла?
Думаеш, я – лапаць?
Ты, відаць, забыла,
Што ў народзе кажуць:
"Ты сваю Марынку
Павадзі па рынку,
За свайго Кузьму
Лепшую вазьму... "
...Слёз няма, маўчала,
Лёгкая паходка.
Нібы ад прычала
Выйшла ў мора лодка...

## АЎЦЮКОЎСКАЯ ЛІЧЫЛКА

Летнім днём да Аўцюкоў
Беглі дзесяць дзецюкоў.

Басанож прыскочыў ПЕРШЫ,
Самы дужы і хітрэйшы.

А за ім прыбег ДРУГІ
Са званочкам ад дугі.

Аўцюкоўскі люд прыкмеціў,
Што ад смеху плакаў ТРЭЦІ.

Хоць у ботах, але ж вёрткі,
Даганяў яго ЧАЦВЁРТЫ.

Бег дзяцюк з бутэлькай ПЯТЫ,
Бо спяшаўся ён у сваты.

Нёсся, нібы лось рагаты,
ШОСТЫ, трошкі глухаваты.

З мікрафонам і вясёлы
Быў хлапец вядучым – СЁМЫ.

ВОСЬМЫ – барадой за плот.
Ратаваў увесь народ.

Стала дзеўка каля хаты –
Бегчы перастаў ДЗЕВЯТЫ.

А ДЗЕСЯТЫ, малады,
Не спяшаўся нікуды.

Марафонец быў упарты:
Аўцюкоўцам нёс ён жарты.

## ЗНАЁМСТВА

– Кажаш ты, што з Аўцюкоў?
Дзе ж набраўся мацюкоў?
Тут збіраюць толькі жарты –
Аўцюкоўцаў ты не варты.

Аўцюкоўскі люд харошы:
Любіць гумар, бульбу, грошы...
А хто любіць самагонку,
Перш за ўсё губляе жонку.

І ці бедны, ці багаты –
Прыйдуць да дачкі у сваты.
Ззяюць тут усе паненкі,
Нібы новыя сукенкі.

Ёсць у вёсцы пастанова:
Даваць сыну імя – Вова!
З-за дзяцей дык кінуць варты
Піць, курыць, гуляць у карты.

Людзі тут усе працуюць:
То спяваюць, то жартуюць.
Зараз сталі ганарыцца –
Аўцюкі амаль сталіца.

Недарма: народ багаты,
Небаскробы, а не хаты,
Тут касмічных шмат антэн,
Рыюць метрапалітэн...

Дык прыедзь у Аўцюкі,
Будзеш ты якраз такі...

– 056152 –
Гомельская гарадская
цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма

ЗМЕСТ

ЛідзіАна *Н. Шклярава* . . . . . . . . . . 3
"Вершы – стан маёй душы!" *Г. Атрошчанка* . . . . . . . . . . 5
БЛАГАСЛАВЕННЕ ЧЫСЦІНЕЙ . . . . . . . . . . 9
Удзячнасць . . . . . . . . . . 10
Дождж . . . . . . . . . . 11
Дняпро . . . . . . . . . . 12
Рэчка Вуць . . . . . . . . . . 13
Назва . . . . . . . . . . 14
Чарацянка . . . . . . . . . . 15
Пух таполі . . . . . . . . . . 16
Нарадзіны *В. Пілілей* . . . . . . . . . . 17
Свой дом . . . . . . . . . . 18
Папараць-кветка . . . . . . . . . . 19
Калі б... . . . . . . . . . . 20
З года... . . . . . . . . . . 21
1. Студзень . . . . . . . . . . 21
2. Люты . . . . . . . . . . 21
3. Сакавік . . . . . . . . . . 22
4. Красавік . . . . . . . . . . 22
5. Май . . . . . . . . . . 23
6. Чэрвень . . . . . . . . . . 24
7. Ліпень . . . . . . . . . . 24
8. Жнівень . . . . . . . . . . 25
9. Верасень . . . . . . . . . . 26
10. Кастрычнік . . . . . . . . . . 26
11. Лістапад . . . . . . . . . . 27
12. Снежань . . . . . . . . . . 28
ШТРЫХІ СУСВЕТУ . . . . . . . . . . 29
Каб ведаць . . . . . . . . . . 30
Паэту *А. Грачанікаву* . . . . . . . . . . 31
Пупавіна *Н. Шкляравай* . . . . . . . . . . 32
З дзяцінства *Я. Калашнікаву* . . . . . . . . . . 33
Хай Усявышні чуе нас *А. Алешыне* . . . . . . . . . . 34
Верш выспяваў... *Л. Раманавай* . . . . . . . . . . 35
З Госпадам... *А. Сысу* . . . . . . . . . . 36

Рэцэпт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Нябесны водбліск . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Каля паэта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Крытыку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Бард . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Дзе дзяўчынка... *А. Пушкіну* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Скрыжалі *В. Ткачовай* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Вянок *Г. Атрошчанка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
ВЭЛЮМ ВЕРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Скрыжаванне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Узор чырвоны *В. І.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Ён і я... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Стрэчанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Сон пра хроніку жыцця . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Маўчанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Прыкмета . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Мроя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Вершнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
ГАРЧЫЦЬ СЛЯЗА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Знак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Стары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Памяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Галашэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
На пахаванні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Абрус Радзімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Прадчуванне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Запавет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
АЎЦЮКОЎСКАЯ ЛІЧЫЛКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
Пчаляру . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Трынаццаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Сабачае вяселле . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Спатканне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Ой, Кастусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Ноч у дарозе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Здзек . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Аўцюкоўская лічылка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Знаёмства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73

Літаратурна-мастацкае выданне

*ЛідзіАна (Возісава Лідзія Пятроўна)*

**ВЫТОК ПАЧУЦЦЯЎ**

Вершы

Т-н: 5-32-44-10
50-03-41

Рэдактары *Н. Н. Шклярава, С. С. Пуховіч*
Карэктары *К. М. Возісава, І. Ул. Слюсарава*
Камп'ютэрны набор *С. В. Піменаў*

Падпісана да друку 16.11.2007. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Times. Друк на рызографе.
Ум. друк. арк. 2,34. Ул.-выд. арк. 4,42. Тыраж 100 экз. Заказ 2496.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Полеспечать»
246707, Гомель, Савецкая, 1.
ЛВ 02330/0133494 ад 06.12.2004.

Надрукавана з арыгінала-макета аўтара ў друкарні
УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарта»
246653, Гомель, Кірава, 34.
ЛП № 02330/0148780 от 30.04.2004.